УДК 811.161.3'374
ББК 81.2Беи-4
К30

Каўрус, А. А.
К30 Словаклад : слоўнік адметнай лексікі / Алесь Каўрус. — Мінск : Выдавецкі дом «Звязда», 2013. — 328 с.
ISBN 978-985-7059-47-8.

У слоўніку даецца тлумачэнне больш як трох тысяч беларускіх слоў, даўніх і тых, што ўзніклі ў наш час, якія ўжываюцца ў мастацкіх і навуковых тэкстах, у мове сродкаў масавай інфармацыі.

Слоўнік можа выкарыстоўвацца ў сярэдняй і вышэйшай школе, а таксама як даведнік для журналістаў, пісьменнікаў і рэдактараў.

УДК 811.161.3'374
ББК 81.2Беи-4

ISBN 978-985-7059-47-8

© Каўрус А. А., 2013
© Афармленне. РВУ «Выдавецкі дом «Звязда», 2013

ПРАДМОВА

Лексічнае багацце беларускай літаратурнай мовы найбольш поўна пададзена акадэмічнымі слоўнікамі: руска-беларускім, беларуска-рускім, тлумачальным ды іншымі. Падрыхтоўка такіх слоўнікаў патрабуе шмат працы і часу — як істотна абноўленыя і дапоўненыя яны выдаюцца рэдка. А значыць, на іх старонкі не трапляюць многія словы, што выкарыстоўваюцца ў мастацкіх і навуковых тэкстах, у мове сродкаў масавай інфармацыі.

Вядома, і без лексікаграфічнага "ўзаконення", так бы сказаць, без прапіскі, гэтыя словы выконваюць свае функцыі. Але выяўленне, спарадкаванне і публікацыя іх у выглядзе тлумачальнага слоўніка можа паспрыяць больш актыўнаму ўвядзенню некадыфікаваных лексічных адзінак у навуковы ўжытак і навучальна-выхаваўчы працэс, у штодзённую моўную практыку.

Кіруючыся гэтым меркаваннем, на працягу некалькіх гадоў (1998–2005) мы апублікавалі ў часопісе "Роднае слова" значную частку "пазаслоўнікавай" лексікі — слоў, якія не змешчаны ў "Тлумачальным слоўніку беларускай мовы" (1977–1984; скарочана ТСБМ).

Гэта не проста набор, спіс пэўных лексем, а ўжо нібы дадатак да ТСБМ: словы падаюцца ў сістэме, узаемасувязі, прыводзіцца іх семантычная і граматычная характарыстыка. Такім чынам, выяўленыя словы прайшлі першую лексікаграфічную апрабацыю.

Актуальнасць нашай працы вызначаецца не толькі тым, што яна дэманструе ўзбагачэнне літаратурнага слоўніка (і прапануе гэтае багацце чытачу-карыстальніку). На фоне мноства неалагізмаў, якія амаль штодня прыходзяць у беларускую мову з іншых (пераважна з англійскай) і хутка пашыраюцца, усё большую цану набывае выяўленне і папулярызацыя ўласна беларускіх слоў — даўніх і тых, што ўзнікаюць у наш час. Вельмі важна, што гэтыя словы (параўнальна з зафіксаванымі ў слоўніках) паўней адлюстроўваюць самабытнасць, спецыфіку беларускай мовы. У прыватнасці, падаюцца прыметнікі і назоўнікі, якім у рускай мове адпавядаюць дзеепрыметнікавыя формы з суфіксамі *-ущ-*, *-ющ-*, *-ащ-*, *-ящ-*, *-ем-*, *-им-*, *-вш-*, *-ш-*. Напрыклад: *гнятлівы, прыгнётлівы* (рус. гнетущий), *моўца, размоўца* (говорящий),

накіроўчы (направляющий), *нападоўца* (нападающий), *атакоўны* (атакующий), *рассмяяны* (рассмеявшийся), *ранлівы* (ранимый).

Пра адметнасць слоўніка і словатворчы патэнцыял беларускай мовы сведчаць і многія іншыя арыгінальныя паводле марфемнага складу словы, у тым ліку цікавыя і ўдалыя аўтарскія наватворы (некаторыя з іх падаём у "Словакладзе").

За час, які мінуў пасля "роднаслоўскай" публікацыі, некаторыя словы ўжо атрымалі "прапіску" — увайшлі ў найноўшыя слоўнікі. Аднак беручы пад увагу тое, што яны ўпершыню "задзейнічаны" ў нашым праекце "Словы без прапіскі" і яшчэ маюць патрэбу ў лінгвістычнай падтрымцы, лічым мэтазгодным пакінуць такія словы ў новым выданні.

Пры падрыхтоўцы рукапісу кнігі перагледжаны рэестр: адны словы апушчаны, іншыя — уведзены, зроблены ўдакладненні і выпраўленні тэксту.

Распрацоўка і афармленне слоўнікавых артыкулаў грунтуецца на прынцыпах тлумачальнага слоўніка. Варыянты слова, дублеты (і зрэдку сінонімы) прыводзяцца ў адным слоўнікавым артыкуле. Некаторыя з іх падаюцца таксама на сваім месцы ў рэестры з адсылкаю да першага слова загаловачнага радка. Значэнне слоў раскрываецца шляхам тлумачэння (кароткага фармулявання) або праз агульнаўжывальнае, кадыфікаванае слова — адно ці некалькі. Граматычная характарыстыка слоў, граматычныя паметы, а таксама скарачэнні даюцца паводле "Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы" (1977–1984).

Шматкроп'е (...) перад дэфініцыяй асобных слоў сігналізуе, што разглядаецца толькі значэнне, якое не зафіксавана ТСБМ.

Рэестравыя словы падаюцца, як правіла, у адпаведнасці з літаратурнымі нормамі.

Для таго, каб пазбегнуць недакладнасці акцэнталагічнай характарыстыкі рэестравых слоў (часткаю індывідуальна-аўтарскіх, рэдкаўжывальных), націск у іх не ставіцца, за выключэннем адзінкавых выпадкаў, калі адсутнасць значка націску можа ўскладніць адэкватнае ўспрыманне слова.

Сказы-ілюстрацыі захоўваюць асаблівасці мовы (граматыкі і правапісу) тых выданняў, з якіх яны ўзяты.

Слоўнік змяшчае болей за 3 тысячы слоў.

Тлумачальны слоўнік можна выкарыстоўваць для правядзення разнастайнай працы па лексіцы, словаўтварэнні, іншых раздзелах беларускай мовы ў сярэдняй і вышэйшай школе, а таксама як даведнік для выкладчыкаў, журналістаў, пісьменнікаў і рэдактараў.

А

А, *злучн.* ...*Спалучальны, далучальны.* Ужываецца для злучэння і далучэння членаў сказа. *Прыйдзе новы — **а** мудры — гісторык, А ён прыйдзе — ужо ён ідзе...* (Я. Купала). *На плошчу кліча плошча галосна **а** зубаста* (А. Вялюгін). *Дай* [святы анёле] *моцы сіле маёй Знямо́жанай **а** слабой* (Р. Барадулін).

АБАВЯЗАННЕ, -я, *н.* Абавязацельства. *На царскім двары гэта* [умовы звязу Літвы з Расеяй] *дрэнна ўспрынялі, паколькі не было ніякіх гарантый, што ліцьвіны захочуць потым выканаць свае **абавязаньні*** (ARCHE. 2006. № 6).

АБАГУЛЬНЯЛЬНЫ, -ая, ае. Які мае ўласцівасць абагульняць. *Апавяданне напісана рукою майстра, які добра валодае іроніяй, тайнамі стварэння індывідуальных характараў значнай **абагульняльнай** сілы* (М. Лобан).

АБАПЁРТЫ, -ая, -ае. Які абапёрся, абапіраецца. *Толькі жывая практычная справа, памножаная на здабытыя ў навучальных установах тэарэтычныя веды, **абапёртая** на адметнасць таленту, можа забяспечыць светлыя далягляды літаратурна-крытычнаму фронту* (У. Юрэвіч). *На кій **абапёрты**, стары і абдзёрты, Ішоў падарожны адзін* (Я. Купала).

АБВАЛЕНЫ, -ая, -ае. ...Які абваліўся. *Гарэла **абваленая** столь* (В. Адамчык).

АБВОСТРАНЫ, -ая, -ае. Які абвастрыўся (зрабіўся больш напружаным). *Асноўная тэма перагавораў — згладзіць рэзка **абвостраныя** адносіны паміж ЗША і краінамі Еўрапейскага эканамічнага супольніцтва* (Звязда. 8.04.1971).

АБГАВОРВАНЫ, -ая, -ае. Які абмяркоўваецца, абгаворваецца кім-н.– *Я думаю, што кожны з нас за плённейшыя вынікі*